Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Леанід Глушко

# «Я веру ў жыццё…»

біябібліяграфічны паказальнік

Кобрын
2015

УДК 016:82.09(476.7)(092)
ББК 91.9:83(4Беи)
Г55

***Складальнік***
*С. Дз. Курачук* - галоўны бібліёграф
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Г55 **Леанід Глушко «Я веру ў жыццё…»** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2015. - 70 с. : 20 каляр. фат.

Біябібліяграфічны паказальнік прысвячаецца жыццю і творчасці кобрынскага паэта Леаніда Глушко, які ў 2015 годзе адзначае 75-годдзе з дня нараджэння.

**УДК 016:82.09(476.7)(092)**
**ББК 91.9:83(4Беи)**

© Кобрынская цэнтральная раённая
бібліятэка, 2015

# Ад складальніка

Біябібліяграфічны паказальнік прысвячаецца жыццю і творчасці кобрынскага паэта Леаніда Фёдаравіча Глушко, які ў 2015 годзе адзначае 75-годдзе з дня нараджэння.

Літаратурнае жыццё Кобрыншчыны нельга ўявіць без Леаніда Глушко. Амаль 50 гадоў яго творы не сыходзяць са старонак раённай газеты «Кобрынскі веснік» («Камуністычная праца»), а з таго часу, калі ў Кобрыне пачала выходзіць рэгіянальная газета «Кобрин-информ», то і са старонак гэтай газеты.

Нашым паэтам-земляком напісана больш за тысячу вершаў. Леанід Фёдаравіч старанна збірае і захоўвае ўсё, што з яго твораў друкуецца і калі-небудзь друкавалася ў перыядычных выданнях, зборніках. Акрамя кнігі «А я веру», літаратурную спадчыну паэта складаюць больш за дзесяць альбомаў.

Паказальнік мае наступную структуру:

**Прадмова**

**Жыццёвыя ўніверсітэты Леаніда Глушко**: біяграфічны артыкул

**Аўтабіяграфія**

**«З паэзіяй жыву, перамагаю…»**: па старонках літаратурных альбомаў, перыядычных выданняў

**Бібліяграфічныя матэрыялы**

*Творы Л. Глушко*. Гэты раздзел уключае кнігу аўтара, публікацыі твораў у зборніках, часопісах і газетах на беларускай, рускай мовах з 1970 года па 2015 год. Матэрыял згрупаваны ў зваротна-храналагічным парадку.

*Раздзел «Аб жыцці і творчасці»* складаецца з артыкулаў з кніг, зборнікаў, часопісаў і газет на беларускай і рускай мовах за 1995-2011 гады.

**Дапаможныя паказальнікі**

*Алфавітны паказальнік твораў*

*Алфавітны паказальнік зборнікаў і перыядычных выданняў*

Выданне ўключае таксама фотаздымкі з архіва літаратара і фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Пры складанні біябібліяграфічнага паказальніка былі выкарыстаны краязнаўчая картатэка, электронны краязнаўчы каталог, мноства крыніц з часопісаў і газет, якія адлюстроўваюць творы Л. Глушко і літаратуру аб жыцці і творчасці літаратара, біяграфічныя звесткі, прадстаўленныя паэтам, літаратурныя відэапрэзентацыі вучняў турыстычна-краязнаўчага аддзела РЦДТ, вучняў сярэдняй школы № 8 г. Кобрына, прысвечаныя паэту-земляку.

# Жыццёвыя ўніверсітэты Леаніда Глушко

*Я веру ў жыццё, у чысціню душы,*
*чысціню зямлі, веру ў чалавека.*
*Я веру, што жыццё можа быць*
*лепшым, чысцейшым.*

*Л. Ф. Глушко*



Нарадзіўся Леанід Фёдаравіч Глушко 20 жніўня 1940 года ў вёсцы Курыцічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.

«Ку – ры – ці – чы,
Ку – ры – ці – чы», – як песня
Вёска адзываецца мая
Званочкам жаўруковым у дзень весні.
І пошчакам лагодным салаўя,
Зязюляй адзываецца парою,
Нібы то маці голас падае».

Лёня быў чацвёртым, самым малодшым дзіцём у сям'і. Фёдар Глушко, бацька паэта, старшыня калгаса «Бальшавік», арганізаванага ў Курыцічах, пакінуў сваю сям'ю яшчэ да нараджэння малодшага сына. У 1943 годзе ён загінуў пад Ленінградам. З вялікай цеплынёю паэт заўсёды гаворыць пра сваю маці – Аксінню

Максімаўну Глушко (у дзявоцтве Бондар).

У гады Вялікай Айчыннай вайны Петрыкаўшчына была партызанскім краем. Яшчэ ў самым пачатку вайны за сувязь з партызанамі немцы спалілі частку вёскі і хутар Забалоцце, дзе жыла Аксіння Максімаўна з дзецьмі. Сям’я засталася без даху над галавою. Разам з астатнімі жыхарамі вёскі яны пайшлі ў лес, пабудавалі зямлянкі і жылі ў іх да самага канца вайны. Аб гэтых падзеях Леанід Фёдаравіч пазней напіша:

Ужо й хаціны не было,
Пайшла агнём яна да Бога.
Сыйшло пад воблакі цяпло,
Застаўся камень ля парога.
На ім бы з нейкае віны
Маўчала маці. Яблык падаў…
А мы, хрышчэнікі вайны,
Гулялі ў мячык ля прысадаў.

У сваім артыкуле «І ў гэтым маё багацце» Леанід Глушко піша: «*Больш дакладны адрас майго нараджэння – хутар Забалоцце, што ля вёскі. Хутар наш знаходзіўся за вялікім балотам, якое было асушана мясцовым калгасам яшчэ да вайны. А тут – вайна. Згарэла і наша хата. Таму ўсю вайну жылі ў лесе ў куранях і зямлянках. У зямлянцы жыла і наша сям’я – матуля, дзесяцігадовая сястрычка і я. Мне споўнілася дзесяць месяцаў, як прыйшлі ворагі…*

*Выратаваў наш лес – сасновы бор уперамешку з прыгажунямі бярозамі, магутнымі дубамі, грабавымі*

*паланамі, з зараснікамі ляшчыны і ядлоўцу. Лес прытуліў нас, схаваў людзей ад ворагаў, ад смерці. Выжылі! Праўда, маё басаногае дзяцінства, бязрадаснае, галоднае, поўнае слёз засталося дзесьці ў бары. Яно і цяпер, пэўна, блукае там сярод папаратніку…*».

Курыцічы! Курыцічы!
Вы чуеце, Курыцічы?
Як мне па вас курлычацца.
Дзяцінства непрыкметнае
Прайшло вайной задзетае,
Як лецейка адпетае.
Курыцічы! Курыцічы!
Маё дзяцінства скрадзена,
Па папялішчах лазіла,
Цагліны з болем гладзіла.
Курыцічы! Курыцічы!
Вы чуеце, Курыцічы?
Як мне па вас курлычацца?

Клопат пра дзяцей прымусіў Аксінню Максімаўну шукаць заробку ў Заходняй Беларусі, дзе ў першыя пасляваенныя гады захавалася аднаасобная гаспадарка.

«*На час паездак мы жылі ў Людзвінаве ў мамінай сястры Марыі. У яе засталіся двое сваіх дзяцей – Валя і Віця, а муж Цімох, як і наш бацька, загінуў на фронце. Ездзілі жанчыны па чарзе: адна за дзецьмі глядзіць, другая працуе ў людзей, зарабляе хлеб для*

*сям'і*», – успамінае Леанід Фёдаравіч у сваім нарысе «Белы кубак з малаком».

У 1946 годзе Аксіння Максімаўна канчаткова вырашыла пераехаць у Заходнюю Беларусь. Дарога на новае месца назаўсёды запомнілася пяцігадоваму хлопчыку. Праз гады Леанід Фёдаравіч апіша яе ў нарысе «Белы кубачак з малаком», які ён адаслаў на конкурс «Пяшчота маці, радасць дзіцяці». Конкурс праводзіўся Жабінкаўскай раённай газетай «Сельская праўда» ў 2007 годзе. У намінацыі «Публіцыстыка» Леанід Глушко заняў трэцяе месца. Пранікнёнexistence радкі яго твора кранаюць чытача да слёз.

Сям'і Глушко дала прытулак у сваім купэ праваднiца, якая частавала дзяцей малаком, угаворвала маці аддаць ёй на выхаванне белагаловага хлопчыка. Звычайнае малако, якое было наліта ў белы кубачак, пяцігадоваму дзіцяці здалося незвычайна смачным: яны не пілі яго амаль усю вайну. Адыходзячы ўсё далей і далей ад поезда, які прывёз іх у новае і пакуль што невядомае жыццё, хлопчык аглядваўся, моцна тулячы да сваіх грудзей буханку духмянага аржанога хлеба, які дала ім у дарогу добрая праваднiца.

Сям'я Глушко знайшла прытулак у вёсцы Дубай Столінскага раёна. Вёска, у якой налічвалася больш за 600 двароў, знаходзілася на беразе Прыпяці.

Там, дзе Прыпяць коціць хвалі залатыя.
І дзе хлеб багаты з вятрамі шуміць,

Дзе дубы, бярозы, сосны маладыя,
Там мой любы Дубай у квецені стаіць.

Аксіння Максімаўна спачатку нанімалася на працу па дварах, а калі пачалі ствараецца калгасы, працавала даяркай.

Ты не ведала спакою,
У турботах век жыла.
То з сярпом, а то з касою
Ты на працу летам йшла.
А зімою доўга ў хаце
Не тушылася святло:
Кужаль ткала наша маці –
Свайго лёсу палатно.
Ты дала жыццё і шчасце,
Я з цяплом тваім жыву.
Век удзячны табе, маці,
Песні я твае пяю.

Тут, на Століншчыне, прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады. «*Ішоў 1948 год. Я пайшоў у першы клас… Класы знаходзіліся па хатах гаспадароў. Пазней, калі ў Дубаі заснавалі калгас, пабудавалі драўляны будынак школы. Не хапала кніжак, сшыткаў. У класах гарэла лямпа-газоўка*», – успамінае Леанід Фёдаравіч (*Глушко, Л. Вяртанне ў маладосць*).

Тут ён пачаў пісаць і свае першыя вершы, якія з'яўляліся самі сабою, пасля таго, як аднойчы настаўніца дала заданне скласці дома сказы з пэўнымі словамі. Замест асобных сказаў у Лёні Глушко

атрымаўся верш. Разам з першай удалай спробай прыйшло жаданне пісаць. Яго літаратурны архіў пачынаўся з некалькіх радкоў, якія былі апублікаваны некалі ў газеце «Піянер Беларусі».

Весна…
Слышны вздохи весны,
Плачет снег глубокий.
Закипели ручейки
С горки белобокой.
Расстилается над кручей
Пар, как занавеска,
В ярком солнечном луче
Расцвела пролеска.
Агроном спешит на поле
Осмотреть массивы,
Чтобы вовремя расставить
Для посева силы.

А хутка за першай публікацыяй прыйшла і першая перамога – прыз газеты «Зорька» за ўдзел у конкурсе на лепшую галаваломку. З таго часу жаданне пісаць ужо не пакідала Леаніда Глушко ніколі.

Тут, у Дубаі, у 1959 годзе, Леанід скончыў школу, папрацаваў паштальёнам. Затым паехаў у Краснадонскае шахцёрскае вучылішча. «*Тады многія ехалі па камсамольскіх пуцёўках. Мы вырашылі ўсім класам ехаць у Краснадон, авеяны славай герояў-маладагвардзейцаў і абʼяўлены камсамольскай*

*будоўляй – рамантыкі захацелася*», - так тлумачыць гэты свой жыццёвы выбар Леанід Фёдаравіч.

Вучыўся тут і працаваў з 1960 года па 1963 год. Працаваў на шахце 1-4 «Перамога», «Паўночна-гундараўская» машыністам шахтных машын, а ў вольны ад работы час займаўся грамадскай працай, пісаў вершы і замалёўкі ў мясцовыя газеты: «Социалистическая Родина», «Слава Краснодона». Адчуваючы ў сабе нязменную цягу да малявання, паступае ў Маскоўскі завочны ўніверсітэт малюнка і жывапісу. Праўда, скончыць яго не ўдалося: быў прызваны 14 лістапада 1963 года ў армію. Адзін год служыў у Харкаве, два гады – у Баранавічах.

І ў гэты час службы ў арміі хлопец знаходзіў час для любімых заняткаў – вершаў і малявання. Нават скончыў завочную школу ваенкораў пры газеце «Во славу Родины». Яго фельетоны і вершы з'яўляліся ў газеце «Во славу Родины». Ужо ў той час наладзіў сувязі з такімі газетамі, як «Чырвоная змена», «Звязда», «Сельская газета», «На страже Октября».

Як выдатніка ваеннай і палітычнай падрыхтоўкі камандзіра аддзялення радыёаператараў Л. Глушко накіравалі на ўсеармейскую канферэнцыю ў Мінск, дзе перад прысутнымі выступіў П. М. Машэраў – першы сакратар ЦК КПБ. На памяць аб гэтай падзеі ў Леаніда Фёдаравіча застаўся фотаздымак, якім ён вельмі даражыць.



У 1966 годзе, пасля службы ў арміі, Леанід некаторы час працуе карэспандэнтам Луні-нецкай раённай газеты «Ленінскі шлях», затым у мастацкай майстэрні пры Доме культуры, што ў Лунінцы. Так у працоўнай біяграфіі Леаніда Глушко адкрылася новая ста-ронка – мастак-афар-міцель.

Бываюць у жыцці такія асаблівыя сустрэчы, на якія спачатку не звяртаеш увагі, але праз некаторы час разумееш, што гэта сустрэчы з тваім будучым лёсам.
Такія тры сустрэчы былі ў жыцці Леаніда і Аляксандры Глушко. Тры кароткія сустрэчы за сем доўгіх год перапіскі…

Дзяўчына з вёскі Ластаўкі Кобрынскага раёна, якую ён аднойчы, вяртаючыся з водпуска, сустрэў на вакзале ў Харкаве (другі раз сустрэча адбылася таксама выпадкова ў Каменску, што на беразе Паўночнага Данца, а трэцяя – у Баранавічах), да моманту заканчэння яго службы ў арміі працавала ткачыхай ва Уладзімірскай вобласці. У ліпені 1968 года яны пажаніліся.

Свайго жылля на Століншчыне ў маладых не было, таму вырашылі пераехаць ва Уладзімір. Леанід працаваў на ткацкай фабрыцы як мастак-афарміцель.

Але ў хуткім часе з Беларусі прыйшла вестка аб тым, што памерла маці Леаніда.

Мінулі дні, гады. Цябе не стала
У толькі што расквечаны мой час.
А як унукаў ты сваіх чакала!
І даў бы Бог і праўнукаў пад час.

А праз некалькі месяцаў маладая сям’я перажыла яшчэ адну трагедыю - смерць першага дзіцяці. Аляксандра вельмі доўга не магла забыцца на сваё гора, таму вырашана было вярнуцца на радзіму жонкі, на Кобрыншчыну.



Са жніўня 1969 года Леанід Фёдаравіч Глушко жыве і працуе на Кобрыншчыне. З працаўладкаваннем у Кобрыне праблем не было. «Нам такія людзі патрэбны», – сказалі Леаніду Глушко ў Кобрынскім райвыкан-каме.

Была праца ў сярэдняй школе № 4 г. Кобрына, даваў урокі чарчэння і малявання.

Затым праца мастака-афарміцеля на цагельным заводзе, у камбінаце будаўнічых матэрыялаў.

Пасля развалу СССР давялося папрацаваць і друкаром, і рабочым на кансервавым заводзе.

А пасля зноў любімая праца мастака-афарміцеля ў Кобрынскім РБУ-201.

У 2001 годзе пайшоў на заслужаны адпачынак. «*Я падтрымліваю сяброўскія сувязі з калектывам, калі бываю ў РБУ-201, цікаўлюся іх працоўнымі справамі. З цеплынёй мы вядзем размовы з рабочымі, з кіраўніцтвам арганізацыі*», - адзначае Леанід Фёдаравіч.

І вось ужо больш за сорак год лёс паэта Леаніда Глушко звязаны з нашым горадам. За гэтыя гады разам з Аляксандрай Аляксандраўнай выхавалі траіх дзяцей, дачакалі шасці ўнукаў.




Я жыву прыродаю і вершамі
Жыццёвыя ўніверсітэты прайшоў з годнасцю.
Жыццё мне выдала дыплом.
І болей мне не трэба:
Каб быў Радзімы светлы дом,
У доме луста хлеба.
Каб над Радзімаю блакіт
Заўжды быў чысты, весні.
У небе звонкім – жаўрукі,
Усмешка сонца, песні.
Каб мова матчына была,
І дабрата ў сэрцы.
І каб шчаслівая расла
Дзятва на белым свеце.

Леанід Фёдаравіч не развітваецца з творчасцю.



***Я самы багаты.***
***Я самы шчаслівы.***
***З любоўю ў сэрцы***
***Жыву ўсе гады.***

Той немінучы час настане,
Калі пакіну белы свет.
Але адбудзецца спатканне
Праз гэту кнігу. Я паэт?..
Хоць і не ўзняўся я да трона,
Ды ў хаце ветлай светлым днём
Успомняць родзічы Лявона
І спелым памянуць віном.

# Аўтабіяграфія



Нарадзіўся я 20 жніўня 1940 года ў в. Курыцічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля вайны, пакінуўшы папялішча роднай хаты, шукаючы прытулку і кавалак хлеба, матуля з трымя дзецьмі, спынілася ў весцы Дубай Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Тут я скончыў дзесяцігодку.

Папрацаваўшы летам калгасным паштальёнам, паехаў у Краснадарскае шахцёрскае вучылішча. Пасля яго заканчэння тры гады працаваў у шахце і займаўся ў завочным народным універсітэце мастацтваў на факультэце малюнка і жывапісу ў горадзе Маскве. Потым служыў у арміі.

Пасля службы спрабаваў сябе ў журналістыцы, скончыў завочную школу ваенкораў пры газеце «Во славу Родіны». Некаторы час выкладаў урокі чарчэння і малявання. Потым доўгі час працаваў мастаком–афарміцелем.

Вершы друкаваліся на старонках «Чырвонай змены», «Звязды», «Сельскай газеты», у часопісах «Беларусь», «Вясёлка», «Вожык» і іншых выданнях. Дзіцячы верш «Вавёрка» змешчаны ў «Кніжцы–малышцы» (падручніку для пазакласнага чытання).



*Леанід Глушко*

# «З паэзіяй жыву, перамагаю...»

***па старонках літаратурных альбомаў, перыядычных выданняў***




«З паэзіяй жыву, перамагаю...», - гэтыя радкі належаць нашаму земляку, паэту Леаніду Фёдаравічу Глушко, які, дзякуючы сваім творам, вядомы, мабыць, кожнаму жыхару Кобрына, Кобрынскага раёна і нават за яго межамі.

Паэтам, дарэчы, Леанід Фёдаравіч сябе ніколі не называе. «*Проста я не магу жыць без творчасці*, - дзеліцца ён сваімі разважаннямі. – *Наша жыццё такое цікавае і разнастайнае, што абыякавым заставацца немагчыма*» (*Глушко, Л. Крыніца натхнення – жыццё*).

Што ёсць паэзія для Леаніда Глушко? Паэзія, на думку Л. Ф. Глушко, гэта «любоў да ўсіх», «сум і весялосць», паэзія дазваляе бачыць «прыгажосць Зямлі Айчыны, роднага мне краю», з паэзіяй «у



радасці жывецца», з паэзіяй «жыву, перамагаю», паэзія «кліча ўдалячынь», «не дае спакою», без паэзіі «засохне сэрца, голас абарвецца».

Тэматыка вершаў Леаніда Глушко самая разнастайная. Ён піша пра родную мову, Радзіму, родны кут, прыроду і чалавека, каханне, Вялікую Айчынную вайну, вайну ў Афганістане, пра маці…

У яго ёсць вершы-прысвячэнні выдатным асобам Беларусі: Янку Купалу, Якубу Коласу, Пятру Машэраву, Дзмітрыю Фалькоўскаму, Яўгеніі Янішчыц, ёсць сатырычныя і гумарыстычныя вершы, а таксама шмат дзіцячых вершаў. Тэматычная палітра паэзіі нашага земляка багатая і разнастайная.

У творчасці Леаніда Глушко выразна вылучаецца некалькі тэм:

►Радзімы, роднага кутка («Мая Радзіма, «Кобрынская вясна» і інш.);

► грамадзянская, патрыятычная лірыка («Палет Гагарына», «Дзень Перамогі» і інш.);

► маці («Зямны паклон табе, матуля, нізкі», «Ля веснічак змяту я пыл з дарог»);

►экалогіі, прыроды («Звіняць Чарнобыля званы», «Як птушкі, праплываюць белыя аблокі», «Ручай бяжыць», «Грыбная радасць», «Аселі лёгкія туманы», «Залатая завея лістоў» і інш.);

► сатырычная вершы («Вось дык жарт!», «Свіння на пляжы», «Баран – хвалько», «Максімава перабудова» і інш.).












Вершы Л. Глушко прываблiваюць сваiм жыццялюбствам, паэтычнай iнтанацыяй, народным характарам. Паэту ўласцiвы шырокi духоўны дыяпазон, выразны грамадзянскi тэмперамент, пяшчотны лiрызм, чалавечнасць. Усё навакольнае паўстае ў яго творах як частка ўласнай душы i лёсу паэта. Аднак яна лёгкая для чытацкага ўспрымання.

У адным са сваiх iнтэрв'ю, дадзеным карэспандэнту Жабiнкаўскай раённай газеты «Сельская праўда», Леанiд Глушко прызнаецца: «*Кожны, хто пiша, мае пiльную патрэбу быць прачытаным. Гэта з аднаго боку. А з другога – калi друкуюць, сам адчуваеш, што робiш патрэбнае для iншых… Я пастаянна збiраю ўсё, што маё друкуецца ў перыядычных выданнях»* (Бендзярук, Р. Шмат-баковы талент).

Вершы Л. Глушко ўвайшлі ў літаратурныя альманахі «Жыві, мая крыніца», «Рачныя напевы», «Галасы Палесся», «Берасцейскія карані».

Леаніду Глушко прысвечана старонка ў кнізе «Літаратурная карта Берасцейшчыны». А дзіцячы верш «Скок вавёрка на дубок» увайшоў у падручнік для пазакласнага чытання ў першым класе выдавецтва «Народная асвета».







Леанід Фёдаравіч старанна захоўвае свае літаратурныя альбомы. Сярод іх «Рунь», «Санцаграй», «Раніца».



Перагортваючы старонкі літаратурных альбомаў, здзіўляешся шматбаковасці яго літаратурнага таленту. Акрамя вершаў, артыкулаў, нарысаў, замалёвак, якія былі надрукаваны ў розны час у перыядычных выданнях, у літаратурных альбомах паэта можна пабачыць па-майстэрску зробленыя малюнкі, сямейныя фотаздымкі, здымкі цудоўных куткоў роднай зямлі. Многія з іх маглі б стаць ілюстрацыямі да яго твораў.

Сёння творы Леаніда Глушко можна сустрэць на старонках рэспубліканскіх газет «Белорусская нива», «Звязда», «Чырвоная змена», «На страже», «Во славу Родины», «Транспортный вестник», часопіса «Беларусь». У свой час вершы Леаніда Глушко друкаваліся на старонках часопіса «Вожык», дзіцячага часопіса «Вясёлка».

Актыўна супрацоўнічае Леанід Глушко з раённай газетай «Кобрынскі веснік». «*Я сябрую з «Кобрынскім веснікам» з 1969 года. І цяпер помню, як даслаў у газету, якая тады насіла назву «Камуністычная праца», сваю першую замалёўку пра школьны баль… Мае вершы друкаваліся і цяпер друкуюцца на літаратурнай старонцы. Сяброўства з «Кобрынскім веснікам» – тая жыватворная крыніца, якая натхняе, дае радасць і энергію для напісання новых паэтычных радкоў*» (Глушко, Л. Кобрынскаму весніку - 70 год).

Хоць я няштатны твой рабочы,
Ды ўклад уношу ў справу свой.
Не засынаю часта ноччу,
Як гаварыць хачу з табой.
Мая сяброўка – ты газета!
Я рады, што такая ёсць,
За сувязі зімой і летам,
Што йдзеш да нас, як добры госць.

*Сябрую з газетай*

Леанід Глушко супрацоўнічае таксама з такімі раённымі газетамі, як «Навіны Камянеччыны» (Камянецкі раён), «Сельская праўда» (Жабінкаўскі раён), «Навіны Палесся» (Столінскі раён), «Петрыкаўскія навіны» (Петрыкаўскі раён Гомельскай вобласці).

З-пад яго пяра выходзяць усё новыя і новыя радкі…

Паэзія – мая любоў да ўсіх:
Да чалавека, поля, да бярозкі,
Да кветак дзіўных лугавых,
Багаты чым заўжды наш край палескі.
Паэзія нам не дае спакою.
З паэзіяй – мы вечныя рабы
З гарачай паэтычнай галавою.

*Мая паэзія*

Паэзія – гэта ўзлёт душы, вера ў прыгажосць, высокія пачуцці… Паэзія – гэта чароўная мелодыя душы ў словах, у радках на паперы.

Увогуле, творчасць нашага паэта-земляка прасякнута аптымістычнай вераю ў лепшыя якасці чалавека, у маральную чысціню, у перамогу дабра над злом. Невыпадкова зборнік яго паэзіі атрымаў назву «А я веру».

«*Я веру ў дабрату людзей, я веру ў сябе самога*», – выказваецца паэт у сваім аднайменным вершы. «*Няхай з намі Вера заўсёды жыве!*» – піша Леанід Глушко і ўдакладняе. – «*Вера…святая*».




У кнігу ўвайшлі лепшыя творы, напісаныя Леанідам Фёдаравічам за доўгія гады творчай працы. Тыраж невялікі – 200 экземпляраў. Гэта толькі невялікая частка таго, што створана паэтам за доўгія гады творчай працы.

Лірычны герой вершаў Леаніда Глушко – чалавек, для якога родная мова, роднае слова – сродак выяўлення душы:

Кожны гук любімай мовы
Сэрца закранае.
З гукаў складзенае слова
Песняю лунае.

Спеў матулі на дажынках,
На жытнёвым полі
Шум бурштынавых дажджынак
На лісці таполі.
Ці гудзе сасоннік звонкі,
Ці шапоча колас –
Мова роднае старонкі,
Беларускі голас.
Кожны гук любімай мовы
Сэрца закранае.
З гукаў складзенае слова
Не змаўкае.

*Кожны гук любімай мовы*



У вершы, які так і называецца «Родная мова», паэт шчыра гаворыць, што ніколі не здрадзіць «Мове маці любае», што ён ганарыцца ёю, без мовы яму няма жыцця.

Мова – боль мой вечны, мая радасць,
Маё шчасце, песня і спакой.
Майго сэрца мове ўся адданасць
Мове роднай, матчынай, святой.
Жытні колас шэпча мне на полі,
Лес гамоніць і пяе ручай
На дзівосным родным, вечным слове.

*Родная мова*

У адным са сваіх інтэрв'ю, дадзеным газеце «Кобрынскі веснік», Леанід Фёдаравіч прызнаецца: «*Мова для мяне – маё жыццё… Вядома, пісаў на розных, але найбольш – на сваёй. На ёй лепш пішацца*» (*Кобрынскі веснік. 2005. 3 верасня*).

Спяваю песні.
П'ю нагном з крыніцы.
За ўсё жыццё ніяк не наталіцца
Гаючай, чыстай, срэбнаю вадою,
Як і любоўю для мяне святою,
Як мовай роднай, дарагою.
Я – беларус!

*Я – беларус*

«Я – беларус!» - гучна і ўрачыста заяўляе лірычны герой верша. Гэта і нацыянальнае самавызначэнне, і гордасць за нацыянальную прыналежнасць, адсюль любоў да ўсяго беларускага.

Паэт па-грамадзянску горача сцвярджае непарыўную духоўную повязь з Радзімай і роднай мовай.

Няма Радзімы без сяброў,
Без светлага кахання,
Як немаўлятаў – без буслоў,
Як сонца – без світання.
Няма радзімы без вясны,
Як без пасаджанай рабінкі.
Мая любоў – мой край лясны! –
Як гэта неба без хмурынкі.
І твой блакіт, валошкі сінь,
Бы вочы матчыны струменяць!..
Радзіма, я твой крэўны сын,
Цябе замежжы не заменяць.

На думку Леаніда Глушко, Радзіма не можа існаваць «без сяброў», «светлага кахання», «без вясны», «без пасаджанай рабінкі». Гэта так натуральна, як няма «немаўляткаў без буслоў», «сонца без світання».

Паэт удакладняе паняцце радзімы – гэта «край лясны». Асноўная думка гучыць у двух апошніх радках верша: «*Радзіма – я твой крэўны сын. Цябе замежжы не заменяць*».

Найвялікшае шчасце для паэта – адчуваць крэўную еднасць з роднай зямлёй. Радзіма для паэта – гэта і родная старонка Беларусь, і мілае сэрцу Палессе.

Не разлюбіць мне край лясны –
Маё Палессе дарагое.
Няма святлейшай стараны,
Тут месца самае святое.

Вобраз роднага Палесся для Леаніда Глушко самы светлы, дарагі і святы, у яго сваё разуменне ўнутранага зместу слоў «родны край», «роднае Палессе».

Край задуменных бяроз і каліны,
Край срэбразвонных крыніц і азёр.
Край, дзе сустрэўся з красуняй – дзяўчынай,
Якіх на Палессі нібы на падбор.
Тут мова матулі гучыць дзіўнай песняй.
І дораць крыніцы гаючы глыток.
У сэрцах дабро нараджае Палессе,
Дзе шчасця майго і працяг, і выток.

*Маё Палессе*

Любоў да Радзімы ў вершах Л. Глушко – гэта адчуванне трывалай, непарыўнай сувязі са сваёй зямлёй.

Усё ад Радзімы ў мяне:
І колер, і мова, і рэчы,

І дух Беларусі жыве.
Маю я права назвацца
Сынам яе на вякі,
Мая беларусачка-маці
Мяне нарадзіла такім.

*Мая Беларусь*


МОЙ КРАЙ

Край задуменнай бярозы, каліны,
Край срэбназвонных крыніц і азёр,
Край, дзе сустрэне такая дзяўчына,
Што загарышся, бы ўночы касцёр.

Мова матулі гучыць дзіўнай песняй.
Студня тут дорыць гаючы глыток,
Нашу любоў нараджае Палессе.
Тут майго шчасця — працяг і выток.

Наогул, патрыятычныя матывы – вядучыя ў творчасці Леаніда Глушко.

Традыцыйнымі ў беларускай паэзіі застаюцца вершы пра вёску, бацькоўскі кут. Такія вершы ёсць і ў нашага паэта-земляка. Леанід Глушко - выхадзец з вёскі, і таму невыпадкова, што з яго вуснаў гучаць вершы пра родную вёску. Вёска – мацярык, які неадольна прыцягвае да сябе, дае мацунак, выклікае тугу.

Зямля крыжоў, апаленых вайною,
Зямля дзяцінства горкага і слёз…

Дзе б я ні быў, заўжды яна са мною
З адвечным сваім пошумам бяроз.

*Зямля бацькоў*

Душа і думкі паэта даўно прылучаны да беларускай вёскі. Поруч з «вясковымі ідыліямі» і настальгічнымі матывамі гучаць драматычныя матывы і інтанацыі, звязаныя з выміраннем беларускай вёскі.

Калісьці тут было жытло.
Калісьці тут жыццё цякло.
Каліс дзяцінства тут ішло.
І бэз буяў ля хаты гэтай,
І спелі яблыкі ўлета.
Шмат гаманы і весялосці.
Былі тут часта-часта госці.
Цяпер хаціна ссірацела,
Сцяжына к хаце адзічэла:
На ёй – дзядоўнік, лебяда
І… аніводнага сляда.

*Калісьці тут было жытло*

Часам паэту дастаткова адной ёмістай дэталі, аднаго паэтычнага вобраза, каб зашчымела сэрца чытача. Такім вобразам з’яўляецца вобраз бусла, які, вярнуўшыся з выраю, не знаходзіць той хаты, на якой некалі збудаваў гняздо.

Кружыць бусел, родны бусел,
Не знаходзіць хаты той,
Дзе над небам Беларусі

Збудаваў гняздо вясной.
Дзе пражыў нямала летаў,
Птушанят-дзяцей расціў.
Скуль не раз у вырай злётаў,
А застаўся вось адзін.
Павалілася хаціна,
Зруйнаваны сад датла…
Кружыць бусел-сіраціна
Наб абломкамі жытла.

*Кружыць бусел*

У артыкуле «І ў гэтым – маё багацце», змешчаным ў газеце «Народная трыбуна» за 28 красавіка 2001 года Леанід Глушко піша: «*Кажуць, у кожнага чалавека Радзіма адна. А мне хочацца расказаць ажно аб трох хоць трошачкі: гэта – Петрыкаўшчына, Століншчына, Кобрыншчына. Да іх мая сыноўняя любоў душы і сэрца»*.

Асобную старонку ў паэзіі Леаніда Глушко займаюць вершы-прысвячэнні такім блізкім сэрцу паэта мясцінам, як Петрыкаўшчына, Століншчына, Кобрыншчына.

З Петрыкаўшчынай у першую чаргу звязана вёска Курыцічы, недалёка ад якой знаходзіўся хутар Забалоцце, дзе нарадзіўся паэт.

«Ку-ры-ці-чы,
Ку-ры-ці-чы», - як песня,
Вёска адзываецца мая.

*Зямля бацькоў*

«Анёлы памяці» зноў і зноў вяртаюць лірычнага героя да сцежак ваеннага дзяцінства, да роднага папялішча (у гады Вялікай Айчыннай вайны быў спалены родны хутар паэта – Забалоцце, недалёка ад Курыціч).

Я зноўку ў гасцях у Курыцічах родных,
Асфальтам прастую пад засенню дрэў.
І…міма праходжу. Зноў чую той подых,
Калі матчын дом да падвалкаў згарэў.

Там, на Петрыкаўшчыне, і зараз жывуць родныя і сябры. Леанід Фёдаравіч актыўна супрацоўнічае з Петрыкаўскай раённай газетай «Петрыкаўскія навіны». Петрыкаву адрасаваныя самыя шчырыя словы паэта.

Родны наш Петрыкаў, сэрцу любімы.
Над Прыпяццю, ціхай любімай палескай ракой.
Ты з купаламі святынь залатымі
І горада чыстай маёвай красой.

*Наш Петрыкаў*

На Століншчыне прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады паэта, там жыве яго сястра Ніна, жывуць аднакласнікі, сябры, там пахавана мама…

Вёсачка ў глыбінцы
Любага Палесся.
Там дзяцінства сцежка
І юнацтва песня.
Там маё прызнанне
У каханні любай:

Памятаеш гэта,
Мая вёска Дубай?
Там мая матуля
Ля крыжа з вяночкам –
Ціха сустракае
Роднага сыночка.

*Матулін голас*

Прапушчаны паэтам праз сэрца і паэтычны вобраз Століна.

Тут зоркі на Гарынню
Здаецца, ярчэй і бліжэй.
Тут словы чысцейшаю плынню
Віруюць у мове людзей.

*Родны Столін*

«*Трэці адрэзак жыцця*, - прызнаецца Леанід Фёдаравіч, - *звязаны з Кобрынам. Адсюль родам мая адзіная любоў. Тут нарадзіліся мае дзеці, унукі»*.

Даволі прыкметны тэматычны пласт у творчасці Леаніда Глушко займаюць вершы, прысвечаныя гораду Кобрыну.

Мяне паклікаў Кобрын да сябе,
Мне назаўжды стаў родным горад гэты,
І вось цяпер я думаю сабе:
У чым ён мае еднасці сакрэты.

Роднаму гораду Леанід Глушко прысвяціў такія вершы, як «Наш горад», «Квітней ты, наш Кобрын!», «Квітней ты, Кобрыншчына наша!», «Наш Кобрын»,

«Вечаровая казка», «Кобрыну», «Над Кобрынам сонца высокае» і інш.

У вершы «Кобрыну» Леанід Глушко спрабуе зрабіць храналагічны эксурс у гістарычнае мінулае горада. Пачынаючы з таго часу, калі «тут Дулебавы пасяліўся гурт. Каля Кобрынкі і Мухаўца» і калі, «… як цуд – Перамога прыйшла!»

У вершы «Над Кобрынам неба высокае» паэт аддае даніну павагі воіну-вызваліцелю:

Над Кобрынам неба высокае,
Сонцам цвіце далягляд.
І бачыць у задуме далёкае
У скверы савецкі салдат.

Паэт бачыць вытокі мужнасці салдата-вызваліцеля ў далёкім гістарычным мінулым.

Зямля, дзе прайшоў Сувораў,
І шведа разбіў у той час…
У лепшае воін наш верыў,
Агонь у душы не пагас.

А ў вершы «Вечаровая казка» пейзаж роднага горада робіцца прыгожай часцінкай і асновай выяўлення інтымнага пачуцця:

Россып зорак над Кобрынам яркі,
Сярод іх месяц – човен плыве.
Выплыў ён нечакана з-за хмары,
Кінуў золатам тут на мяне.

І па Мухаўцы золатам сее,
Уплятае ў хвалі ракі
Пазалоту й на кветкі лілеі,
І на Кобрын наш родны такі!
І так казачна стала навокал!
Я цябе ў казку гэту вяду.
Паплывём у чаўне мы далёка,
І я песню яшчэ падвяду.

Усе гэтыя вершы напісаны эмацыянальна, на высокім уздыме патрыятычных пачуццяў. Яны ўспрымаюцца як своеасаблівы гімн гораду, з якім непарыўна звязана жыццё паэта.

Будзе мір. Будзе сонца. І песні
Разляцяцца над роднай зямлёй.
Ты квітней, горад Кобрын любімы,
З кожным годам і з кожнай вясной!
*Квітней ты, Кобрыншчына наша!*

Леанід Глушко адносіцца да таго пакалення, дзяцінства якога было абпалена вайною. Ён называе сваё пакаленне «хрышчэнікамі вайны».

Ужо хаціны не было,
Пайшла агнём яна да Бога.
Пайшло пад воблакі цяпло,
Застаўся камень ля парога.
Над ім, бы з нейкае віны,
Маўчала маці. Яблык падаў…

А мы, хрышчэнікі вайны,
Гулялі ў мячык ля прысадаў.

*Абразок маленства*

Таму зразумела, што тэма вайны, памяць пра яе займае значнае месца ў паэзіі Л. Глушко.

Напамін вайны яшчэ
Устрывожыць сэрца.
Цяжкім болем у грудзях
Не раз адзавецца.

*Напамін вайны яшчэ болем адзавецца*

У вершы «Ён лёг пад танк апошняю гранатай» паэт услаўляе так званы «будзённы гераізм».

У «Палескай баладзе» паэт распавядае пра самаахвярны подзвіг маці, якая, ратуючы сваё дзіця, гіне ад фашысцкай кулі.

Родны хутар паэта Забалоцце, што на Петрыкаўшчыне, быў спалены ў гады вайны фашыстамі. Ці не таму паэту так зразумела трагедыя Хатыні?!

Вам я, Хатыні, свой верш прысвячаю.
Гэтулькі ў свеце жалю, адчаю!
Вы не згарэлі, вы не забыты,
Хоць расстраляны, хоць і забіты.
Светлага шчасця ўсім вёскам жадаю,
Вам, нашы Хаты, свой верш прысвячаю.
Хаты. Хатыні. Хаты. Хатыні.
Смутак радзімы, нашы святыні.

*Прысвячэнне*

Ідэйны змест вершаў «Цішыню вартуюць абеліскі», «Абеліск ля поля», «Алея памяці», «Напамін вайны яшчэ ўстрывожыць сэрца», «Над брацкімі магіламі вясна» ў сцвярджэнні бясконцай удзячнасці жывых перад памяццю тых, хто набліжаў Дзень Перамогі.

За паўнацэннае шчаслівае мірнае жыццё наступных пакаленняў заплачана дарагой цаной. Адсюль у паэта такая глыбокая пашана да ветэранаў вайны («Свята Перамогі», «Даўно іх голавы збялелі», «Вальс ветэранаў», «Прыйшлі на свята ветэраны», «Нізкі паклон ветэранам», «Салдат Перамогі»).

Прайшлі гады. Ён стаў ужо адзіным
Байцом той цяжкай жудаснай вайны.
Праклён дае заўжды салдат вайне.

*Салдат Перамогі*

Думка аб міры праходзіць праз многія творы Леаніда Глушко.

З сярэдзіны 1980-х гадоў мінулага стагоддзя беларускія паэты пачалі адгукацца на ваенныя падзеі ў Афганістане. Трагізм «інтэрнацыянальнай дапамогі», горыч, туга выявіліся ў вершы Леаніда Глушко «Афганскія падранкі».

У вершы «Ляцяць журавы» паэт пералічвае прозвішчы нашых землякоў, якія загінулі ў Афганістане: Дземідовіч,Кірысюк, Корнеў, Лясняк,

Мельнікаў, Тунчык, Хабібулін, Шапяцюк –

Героі нашай Кобрынскай зямлі.
Жыць будуць у памяці народнай.



Пасля Чарнобыля гэтая трагедыя зрабілася вядучай тэматычнай лініяй беларускай паэзіі, што характэрна і для паэзіі Леаніда Глушко.

Матывы чарнобыльскай бяды гучаць у вершах «Ідзе вясна па вуліцы ізноў», «Звіняць Чарнобыля званы», «Чарнобыльскі бусел», «Чарнобыльская драма».



Вобраз атручанай зямлі – распаўсюджаны матыў у творах Чарнобыльскага зместу. Трагічна гучыць матыў бежанства, выгнання з роднай зямлі ў вершы «Чарнобыльская драма»:

Хвалу спявала хлебаробу поле,
Жыты хілілі колас да зямлі…

Счарнеў на полі хлеб даўно ў Заполлі,
Даўно запольцы за палі сышлі.

Не менш трагічна тэма выгнання гучыць і ў вершы «Чарнобыльскі бусел». Бусел, вярнуўшыся з выраю, шукае «…над хатаю буслянку»

Як песня-плач, як рэквіем гучыць верш «Звіняць Чарнобыля званы»:

Звіняць Чарнобыля званы,
Нас адпяваюць.
Пакуль яшчэ жывыя мы,
Але – чакаюць.
Хто сёння пойдзе ад жыцця,
Хто заўтра пойдзе.
І не адно яшчэ дзіця
Магілу знойдзе…

Без твораў пра прыроду немагчыма ўявіць любога сучаснага паэта. Прыродаапісальная лірыка Леаніда Глушко – гэта паэтызацыя красы родных краявідаў, глыбокаэстэтычнае стаўленне да навакольнага свету. Паэт тонка адчувае прыроду, яе жыццё.

Хто не слухаў музыкі прыроды,
Песень бору, ручая, крыніц,
Раніцы, вясны і лета – згодны,
Сэрцам бедны, што і гаварыць.
Слухаў я мелодыю сняжынак,
Як шапоча дождж, іграе гром,
Як спявае поле ў час зажынак,

Ветру слухаў скерца «Буралом».
У мяцеліцу сімфонію падслухаў -
Дзіўны твор любіміцы-зімы.
Колькі ў сэрцы мне ўлілося гукаў!
Быў бы, пэўна, я без іх нямы.

*Мелодыя прыроды*

Паэт імкнецца да гармоніі з прыродай, адчувае цесную знітаванасць з ёй:

*З прыродай хочацца мне зліцца*
*І жыць прыродным хараством.*

*З прыродай хочацца мне зліцца*

Для лірычнага героя твораў Леаніда Глушко прырода – сябра душы, уладальніца дум, куды ён спяшаецца, калі «агорне сум».



Калі мяне агорне сум,
Я паспяшаю ў царства лесу,
Дзе прыйдзе столькі новых дум
І сэрца адзавецца песняй.

*Прырода*

Прырода – крыніца натхнення для паэта Леаніда Глушко.

Тут філасофія свая
Цябе аднойчы зачаруе,
Што пойдзе кругам галава
І муза словам завіруе.

Лес, асобныя дрэвы, травы, кветкі ў пейзажных вершах выступаюць яго суразмоўцамі; з імі, як сябрамі і добрымі знаёмымі, вядзе дыялог паэт (вершы «Прырода», «Размова з клёнам», «Арабінка», «Калінка»).



Клён падаў мне ліст, як руку,
Пяціпалы, залаты:
Як жывеш? Жыцця навуку
Ці асіліў, браце, ты?
- Ат, жыву! І нават веру
Часта ў сонечныя сны.
Адчыняю насцеж дзверы –
Дачакаюся вясны.

*Размова з клёнам*

Пейзажныя вершы паэта адкрываюць багата адораную душу лірычнага героя. Свет прыроды ў творчасці Леаніда Глушко багаты на фарбы, цікавыя сюжэтныя замалёўкі. Для апісання кожнай пары года паэт знайшоў свае непаўторныя словы і паэтычныя вобразы. Але ні аднаму месяцу года паэт не прысвяціў столькі паэтычных радкоў, як жніўню-месяцу. І гэта невыпадкова. Сам паэт нарадзіўся ў гэтым месяцы («Мой жнівень»).

Спелае жыта, спелы колас вянчаюць лета, чарговы круг земляробчых клопатаў і чалавечага жыцця. Такое светаразуменне выявілася і ў паэзіі жніва Л. Глушко. Гэтай тэме прысвечаны такія вершы, як «Жніво», «Зажынкі», «Прыйшлі жнеі на зажынкі», «Пазвалі жней у поле каласы», «Песня дажынак», «Свята хлебаробаў», «Дажынкі» і інш.

Свята дажынак у дбайным сяле…
Жнівень вусаты ў калёсах
Едзе – ад чаркі павесялеў.
Так у людзей павялося.
Выпіў віна, каравая паеў.
Песняй заліўся з жанкамі…
Доўга гучаў той святочны напеў
Па-над сялом, над палямі.
Ніхто не прыкмеціў, як жнівень пайшоў
Да воза – а свята гучала…
Далёка паехаў, за шаты лясоў,
За горы, дзе сонца стаяла.

Элегічным настроем прасякнуты адзін з лепшых твораў гэтай тэматыкі «Адзінокі журавель». Восеньскі пейзаж і нейкі асаблівы смутак звязваюцца ў паэзіі з журавамі.

Чаго лятаеш, жораў, адзінока
Над восенню з пажоўклаю смугой?
Ці ты ад кліна адляцеў наўмысна.
Ці любы край цябе прываражыў?
Ці гэта так, як кажуць, проста выйшла.

Сам Леанід Глушко – заўзяты грыбнік. Таму так шмат вершаў ён прысвяціў «ціхаму паляванню»: «Грыбная радасць», «Грыбы», «Па грыбы» і інш.

І па лясах, па травах росных
У рост пайшлі баравікі…
Да ранку спяць спакойна сосны.
І неспакойна – грыбнікі.

У сваёй паэзіі Л. Глушко аддае ўвагу і праблеме ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Чалавек адказны за навакольны свет, але вельмі часта выкарыстоўвае яго ў сваіх інтарэсах.

Нанёс сякераю ўдар.
Па голым целе стройнае бярозы,
Затым яшчэ ўдар-касяк.
Аж пацяклі і з гэтай раны слёзы.

Ты, чалавек з сякерай – душагуб!
Не смейся. Я не дзівак, які, Бог знае…
Боль не рабі, балюча сэрцу так,
Яно ж душу, як мы, жывую мае.

*Жывое дрэва*

Такую ж тэму закранае і верш «Плачуць бярозы»:

Не рабіце людзі,
Вы балюча дрэвам,
Хай у лесе будзе
Больш да нас даверу.

Сучасная лірыка кахання – хвалюючая песня паэзіі, яна надзвычай багатая на глыбокія эмоцыі. У літаратурных альбомах Л. Глушко можна таксама знайсці вершы інтымнага гучання: «Прытулю я цябе да грудзей», «Згадка», «Калінавы вечар», «Конік вараненькі», «Ідзем з табою летнім лугам», «Я помню, ты сказала», «Любы», «Вясельныя коні», «Кладачка жыцця» і іншыя, у якіх выяўляецца шматстайнасць інтымных пачуццяў, пранікнёная музыка чалавечага сэрца, поўная непаўторных перажыванняў.

Каханне для лірычнага героя вершаў Леаніда Глушко – «гаючая крыніца»:

Прытулю, прытулю я цябе да грудзей,
Каб з табою навек нам, каханая, зліцца.
Ёсць вялікі жыццёвы закон у людзей:
Разам піць з невычэрпнай гаючай крыніцы.

*Прытулю я цябе*

У любоўных творах валадарыць імпрэсія светлых фарбаў, магія хараства чалавечых пачуццяў.

Увогуле, песня кахання Леаніда Глушко неўяўляльная без прыроды – яе вечнай спадарожніцы і спачувальніцы, як ў вершах «Ідзем з табою летнімі лугамі», «Калінавы вечар», «Прытулю я цябе», «Згадка», «Цвіце крушына».

Ідзем з табою летнімі лугамі,
Блакіт высокі жаўранкам звініць,
Схіляюцца рамонкі перад намі,
Раса на вейках кветкавых зіхціць.

*Ідзём з табою летнімі лугамі*

Паэт малюе інтымнае пачуццё ў гарманічным суладдзі са светам прыроды. Лірычны герой Леаніда Глушко – нястомны ў доказах вернасці каханай, у захапленні яе душэўнай прыгажосцю:

Прытулю, прытулю я цябе да грудзей,
Каб з табою навек нам, каханая, зліцца,
Каб збылася адна з самых светлых надзей:
У блакіт тваіх воч мне гадамі дзівіцца.

*Прытулю я цябе*

Каханне ў вершах рамантычнае, узвышанае: «Ты адна – у мяне, у цябе я – адзін, І ляцім да вышынь мы напорыста, смела» («Прытулю я цябе»), «Нам з табой так хораша было У летні дзень ля поля залатога!»,

«Адчуваў я рук тваіх цяпло, Сэрца чалавека дарагога («Згадка»).




Адным з галоўных адрасатаў паэзіі Л. Глушко з'яўляецца яго маці – Аксіння Максімаўна Глушко.

Зямны паклон табе, матуля, нізкі!
Каласком хінуся да цябе…

*Маці*

Вельмі прачулыя вершы ён напісаў пра гэтага роднага і блізкага чалавека: «Матулі», «Як боязна жыць мне без маці на свеце», «Ты не ведала спакою ў турботах век жыла», «Госці», «Маці», «На бялюткі ручнік», «Мінулі дні, гады. Цябе не стала», «Голас маці», «Ля веснічак змятаў я пыл з дарог», «Матуля любая мая», «Спяваю матчыныя песні», «Букет маці», «Горкія слёзы маці» і іншыя.

«*Маёй маме Аксінні Максімаўне Бондар было выдзелена ўсяго шэсць дзесяткаў гадоў. Да*

*апошняга дня яна клапацілася пра нас. Хоць мы былі дарослыя, мелі сем'і*», – прызнаецца Л. Глушко ў адным са сваіх артыкулаў, змешчаным у газеце «Сельская праўда» за 28 сакавіка 2007 год.

А ў сваім артыкуле «Сказ пра маці», змешчаным у гэтай жа газеце за 29 лютага 2007 года, ён прызнаецца: «Я вельмі-вельмі адчуў страту, калі не стала мамы, калі, вяртаючыся на радзіму, магу прыходзіць толькі на яе магілу».

У вершах, якія былі напісаны Л. Глушко пасля смерці маці, выразна адчуваецца, што лірычны герой шмат страціў пасля смерці матулі.

Ля веснічак змятаў
Я пыл з дарог…
Прыйшоў, а там, а там –
Пусты парог.
Душу сцінае боль
Цяжкое нематы
Глухія сцены, столь…
«А дзе ж, матуля, ты?»

*Ля веснічак змятаў я пыл з дарог…*

Горыч ад страты адчувае паэт праз гады:

Няма ў мяне мамы,
І здымак матулін
Сівога мяне да слязінак
расчуліць.

«*Я пражыў ужо амаль свой век. З самага маленства і да старасці хлеб займае ў маім жыцці, як і ў жыцці кожнага беларуса, першаснае месца*», - напісаў Л. Глушко ў невялікім уступе да свайго нарыса «Хлеб», надрукаваным у «Народнай трыбуне» за 2 жніўня 2008 года.

Такое стаўленне да хлеба яшчэ адтуль, з ваеннага і пасляваеннага маленства. Свае адносіны да хлеба як да святыні Леанід Фёдаравіч выказаў у вершах «Хлеб», «Самы святы-хлеб», «Хлебная навука», «Цана хлебу», «Зямля», «На бялюткі ручнік». І такія адносіны да хлеба ад маці-сялянкі.

Любоў да роднай зямлі, да сонца і да хлеба як першаасновы чалавечага жыцця ярка праяўляецца ў глыбокім па сэнсе вершы «Зямля». Любоў да зямлі і хлеба перадаецца ад дзеда ўнуку.

Зямля на далонях, бы хлеб,
Грэе дзядулевы рукі.
…Зямля ў нас, хлопчык, адна –
Як сонца над галаво.
…Трымае ўнук каравай,
Бы сонца.
І сам – быццам сонца.

*Зямля*

Прыкметай паэзіі сучаснага дня стала тое, што імя Бога вярнулася ў нашу паэзію як сімвал духоўнага выратавання і заступніцтва. Гэта прасочваецца і ў паэзіі Л. Глушко: «Дай, Божа, досвіткаў спакойных І

ціхай раніцы святой» («Жданне»); «І я жыву, жыву з душою божай» («Мая душа»); «Маё жыццё, бы ліст, трымціць. Мне б шчэ пажыць, прашу я ў Бога» («Маё жыццё бы ліст трымціць»).

«Я жыву сяброўствам з людзьмі», - гаворыць Леанід Фёдаравіч. І сапраўды гэта так.

Дзякуй Богу, што сябры
Ёсць яшчэ на Палессі!
З імі я пагаварыў –
І ў сэрцы – песні.

*Дзякуй сябрам*

Тэма «сяброўства» пашыраеца ў вершы «Чакаю лістоў». Лірычны герой чакае лістоў ад «сяброў», «братоў», «сясцёр», «ветру з гор», «навальніцы», «срэбразвоннае крыніцы», «Прыпяці», але, на жаль, «я рэдка іх чытаю». Паэту ўласціва адчуванне сувязі і адзінства ўсяго жывога, часоў і пакаленняў, мёртвых і жывых. І сувязь гэту нясуць на сваіх крылах «Анёлы памяці»:

Запалім свечкі на магілах
У светлы дзень святых дзядоў.
Анёлы памяці на крылах
Сюды з нябёс злятаюць зноў.
…Анёлы памяці лунаюць
Жывою памяццю жывых.

А ў сатырычных вершах Л. Глушко асвятляе маральна-бытавыя праблемы. Ён не праходзіць

абыякава побач з п'янствам, разгулам, падманам, хцівасцю.

Наваднілі сексам фільмы,
Тэлеперадачы.
Паспяшае баба Фіма
Да экрана з дачы.

Чалавек з вострым зрокам Леанід Глушко не праходзіць міма заган чалавечага жыцця. Трывогай душы прасякнуты яго сатырычныя і жартоўныя вершы, байкі («Хаўтуры па слану», «Баба Соня і секс» і інш.).

Любімая тэма Л. Глушко - вершы для дзяцей. Як для дарослых, так і для маленькіх, ён піша аднолькава цікава, з хітрынкай. Вершы вабяць сваёй красамоўнасцю, мноствам цікавых назіранняў.

Нездарма некаторыя з твораў яго дзіцяцай падборкі ўключаны ў кнігу для пазакласнага чытання, падрыхтаваную выдавецтвам «Народная асвета».



У вершах, напісаных для дзяцей і пра дзяцей, паэт імкнецца завесці маленькіх чытачоў у дзівосны свет роднай мовы, садзейнічаць выхаванню павагі, чуйнасці да беларускага слова. У дзіцячых творах паэта само собой разгортваеецца дзеянне, натуральна гучаць маналогі і дыялогі. Героі, вобразы выпісаны з даверлівасцю, эмацыянальным захапленнем. Адчуваецца любоў і зацікаўленасць аўтара да дзіцячага свету, да гульняў, да прыроды.

Паэзія Л. Глушко для дзяцей натуральная і простая, як і жыццё дзіцяці. Яна сведчыць, што паэт - добры і шчыры, што ён умее весела смяяцца і падзіцячы непасрэдна здзіўляцца навакольнаму свету.

Узрушаныя гэтымі вершамі, вучні сярэдняй школы № 8 г. Кобрына зрабілі спробу скласці невялікі зборнік вершаў Леаніда Глушко для дзяцей, які назвалі «Хай смяюцца нашы дзеці».




У кніжцы атрымалася чытыры раздзелы:

«Звіняць галасы малечы» (пра інтарэсы, гульні, захапленні малых);

«Шмат гасцей у хаце нашай» (пра жыццё і адносіны дарослых і дзяцей);

«Пойдзем, дзеці, у лес і поле» (пра дзіцячую цікавасць і любоў да роднай прыроды);

«Дружбаю сагрэты» (пра жывёльны свет вачыма дзіцяці).

Гэтыя творы адрасуюцца самым маленькім, дашкольнікам, але яны зацікавяць і іх бацькоў, а таксама і супрацоўнікаў дзіцячых садкоў, таму што вершы Л. Глушко вучаць быць працавітымі, чулымі, клапатлівымі. І, безумоўна, кожны, хто прачытае гэтыя творы, стане крышачку лепшым, дабрэйшым, чысцейшым душою.

Паэзія Леаніда Глушко цікавая, самабытная. Гэта голас нашага сучасніка, якога хвалююць пытанні жыцця і смерці, любві і нянавісці. Лірычны герой твораў умее цаніць жыццё і радавацца шчасцю мірнай працы, востра адчувае сваю адказнасць перад усім грамадствам, яго гісторыяй і будучыняй.

Жыву ў іншым вымярэнні, жыву на воблаках. Пішу.
Я чалавек, бы і нядрэнны, і маю божую душу.
Я размаўляю з чалавекам, Яму ўсю душу аддаю.
Мо хтосьці скажа: Недарэка! – Што часта песні я пяю.
Жыву з уласным я багаццем: Я працаваў, расціў дзяцей,
Дабіўся сам свайго я шчасця. Узяў з жыцця, чаго хацеў.
Унукаў маю. Ім я рады. Прашу ў Бога шчэ пажыць
І не прашу ў людзей спагады, Што сэрца ў мяне баліць.

# Бібліяграфічныя матэрыялы

## *Творы Л. Глушко*

**Глушко, Л.** А я веру : вершы / Леанід Глушко. – Брэст, 2000. – 74 с.

**Глушко, Л.** Агонь душы : памяці Жэні Янішчыц. Вясны дыханне. Маме сонца падару : вершы / Леанід Глушко // Рачныя напевы : літаратурна-публіцыстычны альманах пры Петрыкаўскай раённай газеце «За новыя рубяжы». – 1994. – Вып. 3. - С. 37-38.

**Глушко, Л.** Вавёрачка : верш / Леанід Глушко // Яленскі, М. Беларуская мова ў 1 класе : дапаможнік для настаўнікаў / М. Ясенскі. – Мінск, 1995. – С. 42.

**Глушко, Л**. Зямлі дыханне / Леанід Глушко // Галасы Палесся : літаратурна-публіцыстычны альманах пры Петрыкаўскай раённай газеце «За новыя рубяжы». – 1993. – Вып. 2. - С. 93-95.

**Глушко, Л.** Матчын хлеб. Радасць жніва. Паклон. Святая зямля. Пяе вясна : вершы / Леанід Глушко // Беларускі ручнік : зборнік паэзіі / уклад. Т. Ускова. – Мінск, 2013. – С. 52, 56, 105, 174, 188, 201.

**Глушко, Л.** У родны Петрыкаў прыехаў… Зраўнялі акопы на полі даўно. Восеньскі трыпціх. Ля абеліска. Беларуская бяда. Надзея : вершы / Леанід Глушко // Жыві, мая крыніца : літаратурна-публіцыстычны альманах пры Петрыкаўскай раённай газеце «За новыя рубяжы». – 1991. – Вып. 1. - С. 82-85.

**Глушко, Л.** Бог і хлеб: верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2015. – 1 жніўня. – С. 4.

**Глушко, Л.** Весялосць зімы : верш / Л. Глушко // Кобрынскі веснік. – 2015. –28 студзеня. - С. 5.

**Глушко, Л.** Вясна : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2015. – 15 красавіка. – С. 8.

**Глушко, Л.** Радасць : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2015. – 20 чэрвеня.

**Глушко, Л.** Святочнае : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2014. – 7 сакавіка. – С. 1.

**Глушко, Л.** Вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2013. – 13 верасня. – С. 9.

**Глушко, Л.** Коцік і мышка / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2013. – 25 мая. – С. 10.

**Глушко, Л.** Вандроўнік май : верш / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2012. – 29 мая. – С. 1.

**Глушко, Л.** Вершы для дзяцей / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2012. – 25 жніўня. – С. 3.

**Глушко, Л.** Дзень Перамогі : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2012. –8 мая. – С. 3.

**Глушко, Л.** Памяць / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2012. – 11 сентября. – С. 1.

**Глушко, Л.** Снежны вальс / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2012. – 21 января. – С. 1.

**Глушко, Л.** Веснавая радасць : верш / Л. Глушко // Белорусская нива. – 2011. – 6 апреля. – С. 1.

**Глушко, Л.** Жыць для людзей : верш / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2011. – 3 февраля. – С. 1.

**Глушко, Л.** Кобрынскі вальс / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2011. – 8 студзеня . – С. 9.

**Глушко, Л.** Мой горад : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2011. – 15 кастрычніка. – С. 10.

**Глушко, Л.** Паклон / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2011. – 10 августа. – С. 1.

**Глушко, Л.** Праднавагодняе / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2011. – 29 декабря. – С. 1.

**Глушко, Л.** Салдаты Радзімы / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2011. – 23 февраля. – С. 1.

**Глушко, Л.** Свіння ў лужыне : верш / Л. Глушко // Народная трыбуна. – 2011. – 29 студзеня . – С. 11.

**Глушко, Л.** Ганарымся – гэта наш горад! / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2010. – 17 ліпеня . – С. 1.

**Глушко, Л.** Стихи / Леанид Глушко // Народная трыбуна. – 2010. – 10 красавіка. – С. 11.

**Глушко, Л.** Год роднае зямлі : верш / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2009. – 1 июля . – С. 1.

**Глушко, Л.** Наш горад / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 22 красавіка. – С. 1.

**Глушко, Л.** Радзіма. «Кожны гук любімай мовы…» : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 2 снежня. – С. 8.

**Глушко, Л.** З Новым годам! / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2009. – 30 декабря. – С. 1.

**Глушко, Л.** Песні сэрца : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 19 жніўня. – С. 8.

**Глушко, Л.** Песня дажынак : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 26 верасня. – С. 8.

**Глушко, Л.** Радасць жніва : верш / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2009. – 15 августа. – С. 1.

**Глушко, Л.** Святая зямля / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 4 красавіка. – С. 8.

**Глушко, Л.** Матулі / Леанід Глушко // Народная трыбуна. – 2008. – 26 ліпеня. – С. 11.

**Глушко, Л.** Хлеб : нарыс / Леанід Глушко // Народная трыбуна. – 2008. – 2 жніўня. – С. 11.

**Глушко, Л.** Чарнобыль / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2008. – 26 апреля. – С. 1.

**Глушко, Л.** Алея памяці. Вечаровая казка : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2007. – 21 ліпеня. – С. 8.

**Глушко, Л**. Каб у міры народы жылі : верш / Л. Глушко // Кобрынскі веснік. – 2007. – 8 мая. – С. 6.

**Глушко, Л.** Навагодняе : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2007. – 29 снежня. – С. 1 ; Белорусская нива. – 2005. – 24 декабря. – С. 1.

**Глушко, Л.** Да Перамогі цяжкія дарогі. Іграў аркестр на ўсю Еўропу…: вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 7 мая. – С. 8.

**Глушко, Л.** П’яная машына : верш / Л. Глушко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 26 сакавіка. – С. 7.

**Глушко, Л.** Разведчыца Зіна : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 3 снежня. – С. 3.

**Глушко, Л.** Дзяды : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2004. – 2 ноября. – С. 1.

**Глушко, Л.** Ля помніка Адаму Міцкевічу : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2004. – 22 мая. – С. 3.

**Глушко, Л**. Белы танец : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2003. – 16 января. – С. 6.

**Глушко, Л**. Квітней, наш Кобрын! «Прысядзем, ветэраны, ля стала…» : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 19 ліпеня. – С. 7.

**Глушко, Л.** Сяброўства : верш / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 3 мая. – С. 1.

**Глушко, Л.** У Дзень Перамогі. Салют Перамогі : вершы / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 8 мая. – С. 7.

**Глушко, Л.** У полі руні завесялелі / Леанід Глушко // Белорусская нива. – 2003. – 3 апреля. – С. 1.

**Глушко, Л.** Нашым красуням : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2002. – 10 сентября. – С. 4.

**Глушко, Л.** Юность в солдатской шинели: верш / Леонид Глушко // Заря. – 2002. – 10 сентября. – С. 4.

**Глушко, Л.** Абразок маленства : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2000. – 10 июня. – С. 5.

**Глушко, Л.** З двухтысячным : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда. – 2000. – 6 мая. – С. 5.

**Глушко, Л.** Зіма з летам сустракаецца… : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 2000. – 12 лютага.

**Глушко, Л**. Мая Беларусь : верш / Леанід Глушко // Заря. – 2000. – 11 июля. – С. 4.

**Глушко, Л.** Полесская красавица : стихи / Леонид Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 2000. – 14 студзеня.

**Глушко, Л.** Чаканне. «Абеліск ля поля…» : вершы / Леанід Глушко // Навіны Камянеччыны. – 2000. – 6 мая. – С. 3 ; Сельская праўда (Жабінка). – 2000. – 6 мая.

**Глушко, Л.** Вызваленне : вершы / Леанід Глушко // Навіны Камянеччыны. – 1999. – 2 ліпеня.

**Глушко, Л.** Вясна прыходзіць з першаю пралескай : верш / Леанід Глушко // Заря. – 1999. – 6 марта. – С. 1.

**Глушко, Л.** Зімовы трыпціх : верш / Леанід Глушко // Навіны Камянеччыны. – 1999. – 22 снежня.

**Глушко, Л.** Няма радзімы без вясны : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1999. – 14 красавіка.

**Глушко, Л.** Панеслі лета журавы. Трыпціх : вершы / Леанід Глушко // Навіны Камянеччыны. – 1999. – 6 лістапада.

**Глушко, Л.** Хаўтуры па слану : амаль байка // Вожык. – 1999. - № 7. – С. 5.

**Глушко, Л.** Чарнобыльскі матыў : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1999. – 24 красавіка.

**Глушко, Л.** «Нізкі паклон ветэранам…» : верш / Леонід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1998. – 18 мая.

**Глушко, Л.** Песня маці маёй : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1998. – 14 кастрычніка.

**Глушко, Л.** Цішыню вартуюць абеліскі : верш / Леонід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1998. – 18 лютага.

**Глушко, Л.** Калядная куцця : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1997. – 4 студзеня.

**Глушко, Л.** Прыйшлі на свята ветэраны. Я прынёс букецік… : вершы / Леанід Глушко // Навіны Камянеччыны. – 1997. – 8 мая.

**Глушко, Л.** А я веру : верш / Леанід Глушко // Заря. – 1996. – 31 октября. – С. 4.

**Глушко, Л**. Вячоркі. «Бягуць удалеч паязды» : з паэтычнага сшытка / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1996. – 21 сентября.

**Глушко, Л.** Музыка снегу : верш / Леанід Глушко // Заря. – 1996. – 25 апреля. – С. 3.

**Глушко, Л.** Кляймо вайны : верш / Леанід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1995. – 21 чэрвеня.

**Глушко, Л.** «Крыжыць бусел…» : верш / Леанід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1995. – 1 ліпеня.

**Глушко, Л.** Ажаніўся наш дзядок : верш / Леанід Глушко // Вожык. – 1991. – № 18. - С. 4.

**Глушко, Л.** «Цалую крыж на матчынай магіле…» : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1991. – 19 сакавіка.

**Глушко, Л.** Апошні бой : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1990. – 15 снежня.

**Глушко, Л.** Пракос лугавы / Леанід Глушко // На страже Октября. – 1990. – 15 июля.

**Глушко, Л.** «А мне б – глыток вады крынічнай…» : верш / Леанід Глушко // Чырвоная змена. – 1990. – 6 студзеня ; Сельская праўда (Жабінка). – 1989. – 12 жніўня ; Камуністычная праца. – 1989. – 5 жніўня.

**Глушко, Л.** Максімава перабудова : верш / Леанід Глушко // Сельская праўда (Жабінка). – 1988. – 15 кастрычніка.

**Глушко, Л.** Отчий дом : стихи / Леонид Глушко // Сельская газета. – 1987. – 18 февраля.

**Глушко, Л.** Адлёт журавоў / Леанід Глушко // Заря. – 1986. – 28 августа.

**Глушко, Л.** Прыпяць / Леанід Глушко // Заря. – 1986. – 28 августа.

**Глушко, Л.** Цішыню вартуюць абеліскі / Леанід Глушко // Камуністычная праца. – 1985. – 7 кастрычніка.

**Глушко, Л.** Пасля навальніцы / Леанід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1980. – 6 верасня.

**Глушко, Л.** Беларусі. Лістапад. Песня : вершы / Л. Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1979. – 1 студзеня.

**Глушко, Л.** Пасаджу бярозку : верш / Леанід Глушко // Ленінец (Камянец) – 1973.- 17 лістапада.

**Глушко, Л.** Навагодняе : верш / Леанід Глушко // Камуністычная праца. – 1971. – 1 студзеня.

**Глушко, Л.** Комсомолу : стихи / Леонид Глушко // Камуністычная праца. – 1970. –26 снежня

**Глушко, Л.** Оружие рабкора. Зреет рожь : стихи / Л. Глушко // Камуністычная праца. – 1970. – 8 жніўня.

## *Аб жыцці і творчасці*

**Леанід Глушко** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2008. – С. 313.

**Габрусёнок, А.** Город Кобрин люди украшают / Анна Габрусёнок // Кобрин-информ. – 2011. – 29 сентября. – С. 29.

**Наш** фотаконкурс // Народная трыбуна. – 2011. – 9 красавіка. – С. 12.

Апублікаваны фотаздымак Леаніда Глушко.

**Панасюк, М**. Паэты спадзяваюцца душой / Мікола Панасюк // Кобрынскі веснік. – 2011. – 8 кастрычніка. – С. 9.

Аб творчасці Леаніда Глушко.

**Бензерук, Р.** Спеласць Спасаўскіх яблыкаў / Расціслаў Бензерук // Народная трыбуна. – 2010. – 14 жніўня. – С. 3.

**Сацук, А.** Пад шчасліваю зоркаю / Аляксей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2010. – 18 жніўня. – С. 4.

Да 70-годдзя Л. Глушко.

**Глушко, Л.** Кобрынскаму весніку - 70 год / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2009. - 14 кастрычніка.

Аб творчай сувязі паэта Л. Глушко з газетай «Кобрынскі веснік».

**Шевченко, А.** Судьба поэта / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2009. – 3 сентября. – С. 26.

О поэте Л. Глушко.

**Глушко, Л.** Крыніца натхнення – жыццё / Леанід Глушко // Кобрынскі веснік. – 2008. – 23 жніўня. – С. 4.

**Глушко, Л**. Хлеб : нарыс / Леанід Глушко // Народная трыбуна. – 2008. - 2 жніўня.

**Глушко, Л.** Белы кубак з малаком / Леанід Глушко // Сельская праўда. - 2007. - 28 сакавіка.

Успаміны паэта аб сваім дзяцінстве.

**Глушко, Л.** Вяртанне ў маладосць / Леанід Глушко // Навіны Палесся. - 2007. - 16 лютага.

**Грышкевіч, С.** «Поэтом можешь ты не быть…» / С. Грышкевіч // Заря. – 2003. – 22 июля. – С. 3.

Аб вершах Л. Глушко.

**Глушко, Л.** І ў гэтым маё багацце / Леанід Глушко // Народная трыбуна. - 2001. - 28 красавіка.

**Хільчук, М.** І споўнілася мара / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2001. – 1 студзеня. – С. 7.

Пра кнігу Л. Глушко «А я веру».

**Бендзярук, Р.** Шматбаковы талент / Р. Бендзярук // Сельская праўда. – 1998. - 18 лістапада.

**Глушко, Л.** [Аўтабіяграфія] / Леанід Глушко // Навіны Палесся (Столін). – 1995. – 19 жніўня.

# Дапаможныя паказальнікі

## *Алфавітны паказальнік твораў*


А я веру 25
Абеліск ля поля 38
Абразок маленства 36,37
Адзінокі журавель 44
Алея памяці 38
Арабінка 42
«Аселі лёгкія туманы» 20
Афганскія падранкі 38
Баран – хвалько 20
Белы кубак з малаком 8
Букет маці 47
Вальс ветэранаў 38
Вось дык жарт! 20
Вечаровая казка 35,36
Вяртанне ў маладосць 10
Вясельныя коні 45
Голас маці 47
Горкія слёзы маці 47
Госці 47
Грыбная радасць 20,44
Грыбы 44
Дажынкі 43
Даўно іх голавы збялелі 38
Дзень Перамогі 20
Дзякуй сябрам 50
«Ён лёг пад танк апошняю гранатай» 37
Жданне 47
Жніво 43
Зажынкі 43
Жывое дрэва 45
З прыродай хочацца мне зліцца 41
Залатая завея лістоў 20
Звіняць Чарнобыля званы 20,39,40
Згадка 45,47
Зямля бацькоў.. 30, 31,32
«Зямны паклон табе, матуля, нізкі» 20
І ў гэтым маё багацце 6
Ідзе вясна па вуліцы ізноў 38
«Ідзем з табою летнім лугам» 45
Калінка 42

Калінавы вечар 45
«Калісьці тут было жытло» 31, 32
«Квітней ты, наш Кобрын!» 34
«Квітней ты, Кобрыншчына наша!» 35, 36
Кладачка жыцця 45
Кобрынская вясна 20
Кобрынскаму весніку - 70 год 22
Кобрыну 35
Кожны гук любімай мовы 20, 25,26
Конік вараненькі 45
Кружыць бусел 31,32
Крыніца натхнення – жыццё 18
Любы 45
Ля веснічак змяту я пыл з дарог 20, 47
Ляцяць журавы 38,39
Маё Палессе 29
Максімава перабудова 20
Матулі 47
Матулін голас 33, 34
Матуля любая мая 47
Маці 47
«Маё жыццё бы ліст трымціць» 50
Маё Палессе 29
Мая душа 50
Мая паэзія 24
Мая Радзіма 20
Мая Беларусь 29, 30
Мелодыя прыроды 40, 41
«Мінулі дні, гады. Цябе не стала» 13, 47
Мой жнівень 43
«На бялюткі ручнік» 47, 49
«Над Кобрынам сонца высокае» 35
«Над брацкімі магіламі вясна» 38
«Напамін вайны яшчэ ўстрывожыць сэрца» 38
Напамін вайны яшчэ болем адзавецца 37
Наш горад 34
Наш Кобрын 34
Наш Петрыкаў 33
«Нізкі паклон ветэранам» 38
Па грыбы 44
«Пазвалі жней у поле каласы» 43
Палеская балада 37,38
Палет Гагарына 20
Песня дажынак 43
Плачуць бярозы 45

«Прыйшлі на свята ветэраны» 38
«Прыйшлі жнеі на зажынкі» 43
Прырода 42
Прысвячэнне 37
«Прытулю я цябе да грудзей» 45, 46
Размова з клёнам 42
Родная мова 27
Родны Столін 34
Ручай бяжыць 20
Салдат Перамогі 38
Самы святы-хлеб 49
Свіння на пляжы 20
Свята Перамогі 38
Свята хлебаробаў 43
Сказ пра маці 48
Скок вавёрка на дубок 22
«Спяваю матчыныя песні» 47
Сябрую з газетай 24
Там, дзе Прыпяць коціць хвалі залатыя 9
Той немінучы час настане 16
«Ты не ведала спакою…» 9, 47
Хаўтуры па слану 51
Хлеб 49
Хлебная навука 49
Цана хлебу 49
Цвіце крушына 46
«Цішыню вартуюць абеліскі» 38
Чарнобыльская драма 39
Чарнобыльскі бусел 39,40
Я – беларус 27, 28
Я жыву прыродаю і вершамі 14
«Я помню, ты сказала» 45
Я самы багаты 16
«Як боязна жыць мне без маці на свеце» 47
«Як птушкі, праплываюць белыя аблокі» 20

# Алфавітны паказальнік назваў зборнікаў, перыядычных выданняў

Беларусь
Белорусская нива
Берасцейскія карані
Во славу Родины
Вожык
Вясёлка
Галасы Палесся
Жыві, мая крыніца
Звязда
Зорька
Кобрин-информ
Кобрынскі веснік
Ленінскі шлях (Лунінец)
На страже
На страже Октября
Навіны Камянеччыны
Навіны Палесся (Столінскі раён)
Народная трыбуна
Петрыкаўскія навіны
Піянер Беларусі
Раніца
Рачныя напевы
Рунь
Санцаграй
Сельская газета
Сельская праўда (Жабінкаўскі раён)
Слава Краснодона
Социалистическая Родина
Транспортный вестник
Чырвоная змена

# Змест

**Прадмова** 3

**Жыццёвыя ўніверсітэты Л. Глушко**: *біягра-фічны арт*ыкул 5

**Аўтабіяграфія** 17

**«З паэзіяй жыву, перамагаю»**: *па старонках літаратурных альбомаў, перыядычных выданняў* 18

**Бібліяграфічныя матэрыялы**

*Творы Л. Глушко* 54

*Аб жыцці і творчасці* 63

**Дапаможныя паказальнікі**

*Алфавітны паказальнік твораў* 65

*Алфавітны паказальнік зборнікаў і перыядычных выданняў* 68

Даведачнае выданне

# Леанід Глушко

## *«Я веру ў жыццё»*

*біябібліяграфічны паказальнік*

Складальнік
Святлана Курачук

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіча

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі
Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail: kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by